**Наталля Сліж**
Беларускі інстытут правазнаўства, Гродзенскі філіял

# ДЗЕЙНАСЦЬ СУДА ГАРАДЗЕНСКАГА ВОЙТА Ў 1660–1676 ГГ.

Сістэма гарадскога самакіравання даўно стала прадметам вывучэння. У гістарыяграфіі аналізаваліся пасада войта, яго паўнамоцтвы і функцыі ў горадзе. Васіль Дружчыц звярнуў увагу на важную акалічнасць, што для кожнага горада былі свае асаблівасці пры ўвядзенні і рэалізацыі войтаўства. Войт займаў вышэйшую прыступку ў горадзе: ён прызначаўся для адміністратыўнай і судовай функцыі[1]. Дзейнасць суда гарадзенскага войта ў другой палове XVII ст. не вывучалася.

У асноўным праца гарадзенскіх войтаў прадстаўлена ў пасляваенных крыніцах: кніга войтаўскага суда (1660–1676)[2] і кніга войтаўска-лаўніцкага суда (1659–1676)[3]. Кніга з войтаўскага суда – адзіная, якая захавалася на сённяшні дзень. Яна мае назву «*Akta spraw woytowskich, intestatiey y relaciey roznych potocznych*». Падобныя крыніцы за XVI ст. і за першую палову XVII ст. не дайшлі да нашага часу, што не дае магчымасць прасачыць развіццё гэтай установы на працягу стагоддзяў[4]. Па свайму зместу і структуры кніга войтаўскага суда даволі цікавая, утрымлівае важныя арыгінальныя дакументы не толькі па гораду, але і па павету. Яна адносіцца да катэгорыі паточных кніг.

[1] В. Дружчыц, *Войты і іх улада ў беларускіх гаспадарскіх местах з магдэбурскім правам,* „Arche", 2009, № 7, с. 338–386; З.Ю. Копысский, *Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в*. Минск 1975, с. 85–96.

[2] У кнізе дамінуюць дакументы за 1660–1676 гг, але два не датычыцца да гэта перыяду: першы за 1690 г., а другі – за 1722 г. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ), ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 127–127 адв., 268–268 адв.

[3] Захавалася яшчэ адна кніга з гарадзенскага магістрата за 1689–1693 гг., але ў дадзеным даследаванні яна разглядацца не будзе. НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2–3; ф. 1800, воп. 1, спр. 1.

[4] Напрыклад, рэдкія кнігі войта захаваліся з Коўна, Магілёва, Берасця, гл.: Vilniaus Universiteto Bibliotekos Rankraščių skyrius (далей – VUB), f. 7, Kauno magistrato aktų knyga, 1580-84; Kauno magistrato aktų knyga, 1606-08; Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губернии Витебской и Могилёвской, хранящихся в центральном архиве в Витебске, вып. 30, Витебск 1903, с. 1–164; НГАБ, ф. 1786, воп. 1, спр. 4.

У гістарыяграфіі кніга згадваецца, але не аналізуецца[5].

*Войтаўства.* У Гародні інстытут войтаўства быў заснаваны з прыняццем магдэбургскага права ў 1496 г. Як гэта было ўжо прынята ў Вільні на яго ўтрыманне прызначалася зборы з трох вольных корчмаў (без выплаты падаткаў), лазні, важніцы, васкабойні, а таксама кожны трэці грош з судовых спраў, чыншаў, з судоў, судовых спагнанняў. Войту дазвалялася пабудаваць млын на Нёмане і карыстацца прыбыткам з яго. Наступныя прывілеі (1506, 1576, 1589 і інш.) пацвярджалі прызначанае для войта ўпасажэнне[6]. Якім чынам здзяйсняліся гэтыя выплаты ўсталяваць немагчыма з-за адсутнасці дакументаў. Удакладненні былі ўнесены прывілеям 1541 г. Былі размежаваныя ўрадавыя паўнамоцтвы. Бурмістрам і лаўнікам было забаронена ўмешвацца ў сферы войта, адпаведная забарона была і для войта. Загадвалася пабудаваць новы дом для войта, бо той дом быў ужо стары. З пазнейшых дакументаў вядома, што на ўрад войта яшчэ прызначалася выплата зарукі пры парушэнні права, а таксама на падставе лаўдума ад 20 студзеня 1653 г. спагнанні з ураднікаў, якія адсутнічалі на сесіях (5 коп літоўскіх грошаў)[7]. Рэвізія 1680 г. адзначала, што ў Сухім сяле на ўрад войта прыходзіцца 9 вольных валок[8]. Як вынікае з дакументаў урад войта даваўся пажыццёва[9].

Да 1564 г. пасаду гарадзенскага войта трымалі мяшчане. Ад Дахны Канстанціновіча пачынаецца перыяд шляхецкага кіравання[10]. Пералік гарадзенскіх войтаў, аднак не поўны, вядомы ў гістарыяграфіі[11]. Войт прызначаўся вялікім князем літоўскім. Прызначэнне часта здзяйснялася праз спрыянне ўплывовай шляхты. Змена асобаў на пасадзе адбывалася праз смерць папярэдняга войта, адмаўленне ад пасады, або перадачу пасады.

Войт быў задзейнічаны ў працы двух судоў. Першы суд – гэта менавіта суд войта, дзе прымаліся скаргі і разглядаліся справы з няцяжкімі правапарушэннямі і невялікімі спагнаннямі. Другі суд – войтаўска-лаўніцкі, якія разглядаў справы звязаныя з маёмасцю, крымінальныя справы, актыкоўваў прыватна-прававыя дакументы маёмаснага характару

[5] Аўтарамі кніга была аднесена як да паточных і не была ідэнтыфікавана як кніга войта. З. Яцкевіч, В. Урублеўскі, *Гарадзенскі магістрат у XVII ст.* [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XX ст.*, рэд. А.Ф. Смаленчук, Н.У. Сліж, Гродня 2009, с. 81.

[6] Lietuvos Vaistybes istorijos archyvas (далей – LVIA), f. 1219, ap. 1, b. 937; *Акты Виленской Археографической комиссии*, т. 7: *Акты Городненского гродского суда*, Вильна 1874, с. 60–61, 77; Н. Сліж, *Магдэбургскае права ў Гародні ў канцы XV – першай палове XVI ст.: увядзенне і развіццё*, [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV –XX стст.*, рэд. А.Ф. Смаленчук, Н.У. Сліж, Мінск 2012, с. 14.

[7] Напрыклад, на выпадак далейшых сварак паміж Казімірам Заблоцкім і Валентыем Ялінгай была прызначана зарука на ўрад войта 10 коп літоўскіх грошаў (1665). НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 120 адв., 124.

[8] Zakład Narodowy im. Ossolińskich (далей – Ossolineum), rkps. 5620, s. 27v.

[9] *Lietuvos Metrika (1522–1530)*, 4-oji Teismų knyga, parengė S. Lazutka, I. Valikonitė, Vilnius 1997, p. 355, 387–388.

[10] НГАБ, КМФ-18, спр. 258, арк. 127 адв.–128.

[11] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy*, t. 2: *Województwo Trockie XIV–XVIII wiek*, red. A. Rachuba, Warszawa 2007, s. 353–355. Фактычны перадрук спіса войтаў на беларускай мове, v.: З. Яцкевіч, В. Урублеўскі, *Гарадзенскі магістрат у XVII ст.* с. 96–97.

(тэстаменты, акты куплі продажу, пазыковыя запісы і інш.). Сур'ёзныя справы войт не разглядаў самастойна, а толькі разам з лавай. У абодвух структурах войта мог замяшчаць лентвойт. Так, у прызначэнні на Марціна Градкоўскага Канстанты Александровіч адзначыў, што наменік неабходны ў сувязі з немагчымасцю прысутнічаць увесь час на пасяджэннях суда (1639)[12]. Сапраўды ў першай палове XVII ст. войт вельмі рэдка прысутнічаў у горадзе[13].

Часам змена лентвойтаў адбывалася з канфліктамі. 29 мая 1666 г. у сувязі з абраннем бурмістрам Гануса Паўльсена К. Александровіч прызначыў лентвойтам Казіміра Цвікліча. Ён выканаў прысягу на новы ўрад. Паўльсен быў незадаволены пазбаўленнем пасады. Аднак войт адзначыў немагчымасць адначасова выконваць абавязкі на двух пасадах. Раней (1660), у сувязі з недахопам кадраў, Паўльсен сумяшчаў гэтыя пасады. Аднак час змяніўся, і войт палічыў неабходным вярнуць старыя прынцыпы кіравання[14].

Большая частка XVII ст. праходзіць у горадзе пад кіраўніцтвам гарадзенскага роду Александровічаў (1633–1700). К. Александровіч атрымлівае прывілей на гарадзенскае войтаўства пасля лідскага падкаморыя Аляксандра Трызны ў абозе пад Смаленскам на Багданавай Ваколіцы (18 лістапада 1633 г.). К. Александровічу было дазволена перадаць войтаўства сыну Стэфану Яўстахію, які на той час быў таварышам панцырнай харугвы віленскага ваяводы Паўла Яна Сапегі (20 красавіка 1665 г.). Аднак на ўрадзе Канстанты фігуруе да пачатку 1668 г.[15] Гэта была першая сур'ёзная пасада Стэфана. Значна пазней ён стаў гарадзенскім падкаморыям (1678–1689), маршалкам (1690–1698) і навагарадскім кашталянам (1698–1700)[16].

Амаль адразу пасля атрымання войтаўства у К. Александровіча ўзнік канфлікт зураднікамі (1634). Мяшчане абвінавачвалі войта ў парушэнні іх правоў, гарантаваных прывілеямі вялікіх князёў літоўскіх. У сваю чаргу Александровіч абвінаваціў лаўніка Станіслава Цвікліча і радцу Гануса Фандэберка ў сваявольстве, непадпарадкаванню ўраду, выкарыстанню зброі, стварэнні небяспечных сітуацый у горадзе. Разам з іншымі яны 13 лютага 1634 г. напалі на харугву Сяліцкага, забралі ў яго і таварышаў коней, зброю, серабро, грошы, шаты, а пасля іх прадалі. Абодва не падпарадкаваліся войту. Аднак усе справы былі закрыты і закончаны без прысуду[17]. У сувязі са Смаленскай вайной 1633–1634 гг. па Гарадзеншчыне праходзілі войскі Рэчы Паспалітай. Такім чынам, наяўнасць войска справакавала канфлікты. Мяшчане не падпарадкаваліся войту. Справы былі закрыты, каб сітуацыя

[12] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 4 адв. Прысяга лентвойта М. Градкоўскага надрукавана, гл.: З. Яцкевіч, В. Урублеўскі, op. cit., с. 77–78.

[13] За гэты перыяд захавалася толькі адна кніга з войтаўска-лаўніцкага суда за 1638–1644 гг., што канечне, цалкам не з'яўляецца рэпрэзентатыўнай. НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 43.

[14] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 127 адв.

[15] НГАБ, КМФ-18, спр. 110, арк. 246–246адв.; КМФ-18, спр. 132, арк. 586-587; ф. 1755, воп. 1, спр. 47, арк. 120–120 адв.; ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 150 адв., 159; E. Rimša, *Pieczęcie miast Wielkiego Księstwa Litewskigo*, tłum. J. Sienkiewicza, Warszawa 2007, s. 427–428; *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego*: *Spisy*, t. 2, s. 355.

[16] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego*: *Spisy*, t. 2, s. 560.

[17] НГАБ. КМФ-18, спр. 312, арк. 89 адв.–92.

канчаткова не абвастралася.

К. Александровіч зрабіў яшчэ кар'еру ў Гарадзенскім земскі судзе, пачаўшы ад пісара ён дайшоў да суддзі: пісар (1643–1653), падсудак (1653–1561), суддзя (1661–1669)[18]. Гэта паўплывала на яго статус у павеце. Па сутнасці ў адной асобе сумяшчаліся паўнамоцтвы па ўсяму гарадзенскаму рэгіёну. Таму ў кнігі войта ўносіліся скаргі не толькі звязаныя з горадам, але і з паветам. Акрамя таго, па прычыне зруйнавання маскоўскімі войскамі ратушы пасяджэнні магістрата праходзілі ў розных месцах, у тым ліку ў судовым доме, прызначаным для земскага і гродскага суда[19].

У другой палове XVII ст. К. Александровіч часта прысутнічаў на пасяджэннях і выбарах пасля першага і другога вызвалення Гародні. Ён актыўна ўдзельнічаў у працы магістрата[20]. Верагодна гэта было звязана з фінансавымі прычынамі. Горад аднаўляўся хутчэй пасля вайны, і былі выплаты за судовыя справы.

Войт пільнаваў працу магістрату. Ён падаў пратэстацыю на былых бурмістраў Ганнуса Паўльсена і Яна Зеляпугу, якія не зрабілі справаздачу за мінулы год (1661). Гэта праблема ўзнікла зноў у 1662 г., калі свой тэрмін скончылі Ян Адамовіч і Пётр Ляўковіч. На гэтай жа сесіі К. Александровіч пратэставаў супраць Г. Паўльсена, які не здаўшы ўрад лентвойта наважыўся стаць бурмістрам, а таксама ўзняў пытання аб пазыцы мінулых бурмістраў Яна Адамовіча і Пятра Ляўковіча ў суме 260 злотых. З-за страт падчас маскоўскай акупацыі яны прасілі аб адтэрміноўцы выплат. Праблемы з атрыманнем справаздачы ад бурмістраў узніклі і ў 1665 г. Акрамя таго, Александровіч звяртаў увагу на праблемы, звязаныя з жыдамі. Ён пратэставаў супраць візіту бурмістраў Адама Цвікліча і Ганнуса Паўльсена разам з гарадзенскімі жыдамі да каралеўскіх камісараў. Войт, не без падстаў, бачыў у гэтым магчымую шкоду для горада (1662). Прысутнаму на адной з сесій старшаму жыдоў Ізааку Фаішу Александровіч нагадаў пастанову Уладзіслава Вазы (1634), па якой жыдам дазвалялася мець лазню, толькі для сябе. Наведванне лазні гараджанам і прыезджым магло каштаваць пакараннем у 5 коп літоўскіх грошаў. Фаіш ведаў пра загад і трымаў яго ў сябе (1666)[21].

Стэфан Александровіч, як і бацька, прысутнічаў на пасяджэннях суда, выбарах ураднікаў, прымаў справаздачы бурмістраў, адсочваў пазыкі горада. Ён падаў пратэстацыю на бурмістраў мінулага года (1672) за адсутнасць справаздачы (18 ліпеня 1673 г.). Адам Цвікліч на той час памёр, але яго нашчадкі не з'явіліся на ўрад[22].

З 1689 г. на месцы войта перыядычна засядаў Ян Казімір Матушэвіч, гарадзенскі каморнік. А на пасяджэнні 10 лютага 1691 г. С. Александровіч афіцыйна прасіў яго выконваць функцыі войта. У гэты перыяд сесіі часам праходзілі ў двары С. Александровіча[23]. Ён валодаў пляцам на Рынку, які

---

[18] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego*: *Spisy*, t. 2, s. 560.

[19] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 98.

[20] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 1; ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 6, 10, 11, 16, 111 адв., 120 і інш.

[21] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 45 адв., 53–54, 58, 111 адв., 121, 124.

[22] Ibid., спр. 1, арк. 159–156 адв., 176, 178, 194, 195, 206 адв., 257, 265–265 адв., 268, 269 адв.

[23] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 3, арк. 7, 11 адв., 79 адв., 89 адв., 91, 92, 96.

раней быў у месцкай юрысдыкцыі[24].

У 1698 г. паміж магістратам і жыдамі разгарнуўся моцны канфлікт, у якім Александровіч прыняў бок магістрату. Справа дайшла да Аўгуста II, які на той час толькі стаў каралём. Жыды, пры падтрымцы шляхты, накіравалі скаргу аб перашкодах гандлю соллю і селядцамі, шынкаванню, забароне рамеснікам займацца рамяством без прыналежнасці да цэху. Кароль прыняў бок скаржнікаў і забараніў чыніць перашкоды жыдам войту Стэфану Александровічу, гарадзенскаму старосце Францішку Катовічу. У сувязі з пагрозамі ад Александровіча і іншых асобаў жыды былі ўзяты пад пратэкцыю караля, а пры спробе здзейсніць супраць іх злачынства вінаваты павінен будзе выплаціць 1 000 коп літоўскіх грошаў[25].

Аднак варта адзначыць, што згодна з ранейшымі прывілеямі жыдам было забаронена гандляваць селядцамі і соллю, а таксама займацца рамяством без згоды цэха і магістрата. Магістрат дзейнічаў у адпаведнасці з папярэднімі дакументамі, якія жыды заўсёды імкнуліся абыходзіць. Гарадзенскі кагал скарыстаўся сітуацыяй змены караля і падтрымкай шляхты, каб правесці выгадныя для іх пастановы. Паміж жыдамі і гараджанамі існаваў даўні канфлікт. Эканамічная дзейнасць жыдоў прыводзіла да паніжэння даходаў горада, адпаведна гэта выклікала негатыўную рэакцыю[26]. Александровіч хоць і належаў да шляхты, аднак быў зацікаўлены ў дабрабыце горада. Гэта непасрэдным чынам уплывала на яго ўласныя прыбыткі. Таму ён у канфлікце падтрымаў мяшчан.

*Гародня і павет падчас вайны 1654–1667 гг.* Варта адзначыць, што сістэма кіравання падчас вайны і пасля яе змянілася. Гародня існавала ў наступных умовах. Летам маскоўскія войскі ваяводы Якава Чаркаскага і казацкае войска Івана Залатарэнкі разгарнулі кампанію па наступленню на заходнія гарады ВКЛ. Былі акупаваны Вільня, Коўна, Мерач і іншыя населеныя пункты[27]. 8 верасня 1655 г. яны захапілі Гародню. 19 сакавіка 1659 г. горад зноў перайшоў да ВКЛ. 22 сакавіка Ян Храпавіцкі атрымаў паведамленне аб вызваленні горада войскамі гетмана ВКЛ Паўла Сапегі. У гонар падзеі ў касцёле пры каралеўскім замку ў Варшаве спявалі "Te Deum laudamus". У горадзе стала аднаўляцца жыццё, нават праводзіцца палітычныя падзеі: 14 ліпеня, 8–13 жніўня – сесіі Скарбовага Трыбуналу ВКЛ, 18 ліпеня выбары смаленскага падкаморыя і інш. Аднак вызваленне пратрымалася нядоўга. Ужо 11 снежня войскі ваяводы Івана Хаванскага былі на падыходзе да горада, а 24 – узялі яго без бітвы. Прычынай сталі свавольныя дзеянні шляхты[28].

---

[24] Ossolineum, rkps 5620, s. 47.

[25] НГАБ. КМФ-18, спр. 149, арк. 754–757.

[26] Н. Сліж, *Арганізацыя гандлю ў Горадні ў XVI – першай палове XVII стагоддзя,* [у:] *Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання. Матэрыялы I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 14–16 лістапада 2013 г.)*, Мінск 2014, с. 147.

[27] А.Н. Мальцев, *Россия и Белоруссия* в *середине* XVII в., Москва 1974, с. 97–99.

[28] Багуслаў Радзівіл засцерагаў слуцкіх камісараў у лісце ад 8 студзеня 1660 г. з Караляўца, каб не дазволілі шляхце супрацiўлення і непадпарадкавання каменданту ў Слуцку, бо гэта згубіла Гародню. Archiwum Główne Akt Dawnych (далей – AGAD), Archiwum Radziwiłłów, dz. IV, kopie, sygn. 745, k. 128–131; К. Касажэцкі, *Кампанія 1660 году ў Літве,* Адбітка з 6 нумару часопіса «Arche» за 2006 год, Мінск 2011, с. 112.

У лютым 1660 г. у горад прыйшлі свежыя маскоўскія войскі. Гародню вызвалілі ў верасні, а невялікая група маскалёў пратрымалася ў замку да сакавіка 1661 г. Вызваленне Гародні, як і Коўна было прынцыпова важным для адкрыцця сплаву тавараў па Нёману[29].

Магістрат існаваў падчас акупацыі, але не мог працаваць як раней. Аднак рэгулярныя запісы ў кнігах захаваліся пасля першай інтэрвенцыі з мая, хаця магістрат працаваў ужо ў сакавіку, і да лістапада 1659 г., а ў 1660 г. фрагментарныя запісы з'яўляюцца з ліпеня. Аднавіў нармальную дзейнасць магістрат з 9 верасня, калі адбыліся выбары бурмістраў. Запіс з гэтага пасяджэння наўпрост кажа аб аднаўленні працы ўраду згодна з прывілеямі[30].

У Гарадзенскім павеце падчас акупацыі сітуацыя склалася наступная. Станіслаў Масальскі быў прызначаны на кіраванне Гарадзенскай эканоміяй. Па словах гарадзенскага ваяводы Багдана Апрэліна шляхціч актыўна карыстаўся яе даходамі. Масальскі служыў новай уладзе, трымаў 6 харугваў. Пры гэтым ён кантактаваў з Вінцэнтам Корвінам Гасеўскім і Паўлам Сапегам. У прыватных бяседах Масальскі адзначаў, што ў выпадку прыходу войскаў ВКЛ не будзе ім аказваць супраціву (1657)[31]. Але да гэтага Масальскі непасрэдна прычыніўся да знішчэння войска троцкага ваяводы Мікалая Стэфана Паца, якое рушыла праз Гарадзенскую эканомію (1656)[32]. У 1659 г. Масальскі стаў гарадзенскім падкаморыям і быў на пасадзе да сваёй смерці ў 1670 г. Ян Храпавіцкі аб ім не пісаў у негатыўным святле ў сваім дзённіку[33].

У лісце да цара Аляксея Міхайлавіча ваявода Багдан Апрэлін скардзіўся на паводзіны гарадзенскай шляхты, якая цалавала крыж, а зараз робіць наезды адзін на другога, рабуе, наязджае на эканомію, палюе там. Шляхта, якая прыехала з Польшчы, жыве ў сваіх маёнтках і адмаўляецца прысягаць цару. Да таго ж вядзе перапіску з войскам ВКЛ, распаўсюджвае інфармацыю пра хуткі яго прыход (1656). Пры гэтым былі нараканні на дзеянні ваяводы Апрэліна ў скарзе адрасаваных цару. Андрэй Храпавіцкі абвінавачваў яго ў зняволенні шляхты, збіцці людзей, зборах з таргоў, вядзенне суду па свайму

[29] AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dz. V, sygn. 11208/II, k. 191–194; sygn. 1735, k. 27–30; VUB, f. 7–3/5957, l. 383–383v; J.A. Chrapowicki, *Diariusz*, cz. 1: 1656–1664, oprac. T. Wasilewski, Warszawa 1978, s. 189–190, 198–203, 215, 225, 279–286; *Pamiętniki Samuela i Bogusława Kazimierza Maskiewiczow (wiek XVII),* oprac. A. Sajkowski, Wrocław 1961, s. 273; A. Skororbohaty, *Diariusz,* oprac. T. Wasilewski, Warszawa 2000, s. 65, 74; К. Касажэцкі, *Кампанія 1660 году ў Літве,* с. 110–114, 317–318.

[30] НГАБ, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 1–27; ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 3–7; LVIA, f. 1282, ap. 1, b. 4734, l. 1; Lietuvos mosklų akademijos Vrublevskių Bibliotekos Rankraščių skyrius, f. 16-207, l. 54–54v; P. Borowik, *Funkcjonowanie samorządu miejskiego w Grodnie podczas „potopu moskiewskiego" (1655–1661) oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali,* [у:] *Гарадзенскі палімпсест XII–XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 7 лістапада 2008 г.),* рэд. А.Ф. Смаленчук, Н.У. Сліж, Гародня–Беласток 2008, с. 29–39.

[31] А.Н. Мальцев, op. cit., с. 137; *Акты Московского государства, изданные Императорской Академией Наук*, т. 2, Санктпетербург 1894, с. 565–566.

[32] VUB, f. 7-3/5957, l. 187–187v; К. Касажэцкі, *Стаўленне шляхты ВКЛ да шведскага і маскоўскага панавання ў 1655–1656 гг.*, «Беларускі гістарычны альманах», 2008, т. 15, сш. 1–2 (28–29), с. 202.

[33] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy,* tom 2, s. 300; J.A. Chrapowicki, *Diariusz. cz. 3: lata 1669–1673*, oprac. L.A. Wierzbicki, Warszawa 2009, s. 116.

меркаванню (1656). Па гэтай скарзе было загадана знайсці Храпавіцкага і высветліць сітуацыю[34].

Як і ўся краіна, Гародня і Гарадзеншчына пераажыла вайну з вялікімі людскім і матэрыяльнымі стратамі. Сітуацыю значна ўскладніла пошасць, якая ахапіла Гародню, як і Вільню, Коўна і інш.[35]

Пасля выгнання маскоўскіх войскаў насельніцтва спяшаліся зафіксаваць правапарушэнні, якія адбыліся падчас вайны. Такія дакументы патрапілі і ў кнігу войта. Пра напад на маёмасць заявілі езуіт гарадзенскага калегіўма Сільвестр Дзяжэўскі (1660)[36]. Аб страце дакументаў з-за дзеянняў маскоўскага войска заявілі удава шляхціча Яна Залескага Крысціна (1660), жыд Абрахам Баруховіч[37]. Небяспека зыходзіла таксама ад наёмнага войска. Троцкі ваявода Мікалай Стэфан Пац абвінавачваў харугву Гёюша Брамера ў абрабаванні воласці і збіцці мяшчан ў Хорашчы (Гарадзенскі павет) падчас пастою два тыдні ў лютым 1661 г.[38] Падобныя скаргі сустракаюцца ў іншых судовых установах.

Такім чынам, вайна моцна дэстабілізавала сітуацыю ў рэгіёне. Гародня і павет значна пацярпелі падчас вайны як у людскім, так і матэрыяльным планах. Адпаведна гэта паўплывала на арганізацыю адміністратыўнай і судовай дзейнасці ў горадзе і рэгіёне.

*Праца войтаўскага суда.* Працэдура правядзення суда войта была наступная. Войт прымаў скаргі, у яго адсутнасць – лентвойт, а разглядаліся яны ў лаве. Скаргі заносіліся ў паточныя кнігі. У кнігі войтаўска-лаўніцкага суда яны, як правіла, ужо не ўносіліся, а толькі згадваліся на працэсе.

Кнігі войта вяліся і раней. Гэта можна сцвярджаць на падставе актыкацыі выпісу з войтаўскага суда 1635 г.[39] Увогуле кніга войта ўяўляе сабой зборнік сшытых розных дакументаў. Яны ўсё пранумараваныя, апошні нумар 415. Дакументы захоўваліся ў россыпу, а кніга была складзена пазней. Акрамя дакументаў з войтаўскага суда сустракаюцца скаргі, якія агалошваліся перад бурмістрамі, выпісы з бурмістраўска-радзецкага і войтаўска-лаўніцкага судоў, выпісы з сумесных пасяджэнняў рады і лавы[40]. Важнае значэнне мае тое, што ў кнігу падшыты арыгінальныя дакументы з подпісамі ўраднікаў.

Геаграфічна справы ахопліваюць Гародню і Гарадзенскі павет. Аднак часам сустракаюцца дакументы з іншых мясцовасцей. Гарадзенскі пратапоп

[34] *АМГ*, т. 2, Санктпетербург 1894, с. 500, 514–515.

[35] А.Н. Мальцев, op. cit., с. 165; *Акты Московского государства, изданные Императорской Академией Наук*, т. 2, Санкт-Петербург 1894, с. 575; *Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст.*, Мінск 1983, с. 130; J.A. Chrapowicki, *Diariusz*, cz. 1, s. 305; І. Герасімава, *Маравая пошасць у акупаванай Вільні (1657 год),* «Arche. Гісторыя беларускай штодзённасці», 2012, № 3, с. 96–108.

[36] Ад Дзежэўскага паступілі тры скаргі. Ён абвінавачваў гарадзенскага земскага пісара Станіслава Сапоцьку і яго падданых ва ўзброеным нападзе на вёску Гнойніца (27. 04. 1660 г.), на вёску Каропчыцы (3. 12. 1659 г., былі маскоўскія войскі ў павеце), гарадзенскага шляхціча Крыштафа Малеўскага (5. 07. 1660 г.). НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 2–4 адв.

[37] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 5, 8.

[38] Ibid., арк. 19.

[39] НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 2035, арк. 1–2.

[40] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 52, 75, 98–98 адв. 111–111 адв., 113–113 адв., 115–116 адв., 224–225 адв. і інш.

Юзаф Валевіч падаў для актыкацыі ліст караля Яна Казіміра менскаму архімандрыту Варламу Козінскаму з дазволам адбудаваць базыліянскі манастыр у Менску, які быў знішчаны маскалямі. У адпаведнасці з прывілеям 1655 г. аднаўлялася дзейнасць школы і манастыра, функцыянаванне могілак (1664). Войцех Мілеўскі і Барбара Мендзепетоўна, зямянка горада Львова, далі ліст брату Андрэю Мілеўскаму на права займацца маёмаснымі справамі па памерлых бацьках Канстантыю Медзепе і Барбары Баярскай (1665). Акрамя таго, траплялі скаргі на дзейнасць магістратаў іншых гарадоў. Пісар і лентвойт Крынак Ян Міхновіч абвінавачваўураднікаў Крынак (бурмістра Марціна Міхновіча, радцаў Івана Сцецвіча, Мацвея Зарноўскага і інш.) у нападзе на дом на вул. Маставая над рэчкай Крынка 18 снежня 1674 г. і нанясенні яго маёмасці шкодаў на 450 злотых (1675). Мсціслаўскі падчашы Казімір Станіслаў Храптовіч падаў скаргу на войтаўскі ўрад Ліпска, які не захацеў разглядаць справу. Па кантракту Храптовіч трымаў пляц і моргі у Ліпску ад палкоўніка Уладзіслава Манкоўскага. Аднак калі захацеў зямлю выкупіць, то аказалася што яна застаўлена (1676)[41].

Большая частка дакументаў кнігі – гэта скаргі пададзеныя ў войтаўскі суд. Сустракаюцца як выпісы з суда, так і дакументы на якіх дапісана зверху ці на палях, што яны былі пададзены ў войтаўскі суд. У некаторых выпадках выпісы замацаваны пячаткай войта[42]. Пасля адыходу з пасады К. Александровіча ёю карыстаўся сын Стэфан[43]. Аднак пячатка не заўсёды захоўвалася ў войта. Яна магла быць перададзена лентвойту. Гэта вынікае з выпісу з кнігі войта за 1635 г. і з заявы лентвойта ГанYса Паўльсена. Ён даў пячатку лаўнікам Марціну Шаматуле і Якубу Шараўскаму для апячатвання рэчаў гарадзенскага падпробашча. Аднак яны на той час яе не вярнулі. Паўльсен хваляваўся аб страце пячаткі і яе магчымым неправавым выкарыстанні (1666)[44].

Значная частка скаргаў адносіцца да выпадкаў паміж гарадзенскімі мяшчанам, а таксама паміж мяшчанамі і шляхтай, мяшчанамі і духавенствам, мяшчанамі і татарамі, мяшчанамі і жыдамі. Сярод іх дамінуюць дакументы аб розных правапарушэннях: збіццё, крадзеж, напад, абраза, чараўніцтва, забойства, пералюб і інш. Пра большасць выпадкаў інфармацыя захавалася на ўзроўні скаргаў. Часам сустракаюцца апытанні сведак, агляды пацярпелых. Дробныя справы разглядаў войт. Сур'ёзныя справы перадаваліся ў войтаўска-лаўніцкі суд. Па цяжкіх злачынствах збіралі крымінальны суд[45].

У сферу паўнамоцтва суда войта і звязанай з ім лавы ўваходзілі актыкацыя дакументаў, звязаных з маёмаснымі справамі, і разгляд спрэчак з-за маёмасці. Сярод дакументаў сустракаюцца акты куплі-продажу, тэстаменты, падзелы маёмасці, інтрамісіі, увядзенні ў маёмасць пры нявыплаце пазыкі,

[41] Ibid., арк. 78, 96–96 адв., 393–394 адв., 427.
[42] Ibid., арк. 63, 104 адв., 193, 242, 243, 250, 393.
[43] E. Rimša, op. cit., s. 427–428.
[44] НГАБ, ф. 694, воп. 4, спр. 2035, арк. 1–2; ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 123–123 адв.
[45] Падрабязней пра крымінальныя злачынствы і судовы працэс гл.: Н. Сліж, *Злачынства і злачынцы ў Гародні ў XVII ст.,* «Arche», 2014, № 11, с. 122–182.

інвентары маёмасці[46]. Суд прымаў скаргі па розных маёмасных пытаннях (спадчына, пасаг і інш.)[47].

Да войта накіроўвалі спрэчкі звязаныя з гандлем. Напрыклад, бурмістры Адам Цвікліч і Канстанты Дзіва абвінавачвалі немца Рудольфа Вількоўскага ў гандлі вінам, мёдам, гарэлкай і іншымі таварамі без выплаты падаткаў у скарб (1664). Была зафіксавана скарга прускага купца і мешчаніна Альбрэхта Яна на мешчаніна Войцеха Смяроўскага, які ўзяўся адвесці ў Элк волава на суму 500 злотых, але не выканаў абяцанне (1668). А купец Тамаш Цэнклер заявіў пра страты на 3 000 злотых з-за чаляднiка Давіда Касідоя з Бельска, які загадваў таварам і таемна збег (1669)[48]. Важным дакументам для рэгулявання падаткаў, збораў, гандлю стала пастанова каптуровага суда ад 14 верасня 1675 г. Яна ўсталёўвала зборы за гандаль алкагольнымі напоямі, вызначала меры, парадак гандлю і інш. Кантроль за яе выкананне накладаўся на магістрат і падстаросту[49].

Цэлы шэраг распараджэнняў і скаргаў асвятляюць працу гарадзенскай каморы і мытнай службы. Для актыкацыі была пададзена пастанова аб вольным сплаве лясных тавараў з Гарадзенскай эканоміі да Каралеўца (1662, 1664). Фінансавы стан краіны патрабаваў тэрмінова грошай, а замежны гандаль сыравінай забяспечваў хуткі даход. Андрэй Маладзіла, пісар гарадзенскай мытні, кантраляваў сітуацыю з выплатай мыта гарадзенскімі і замежнымі купцамі праз скарбовага наглядчыка, “бегуноў-жыдоў”. Пры парушэннях скаргі накіроўваліся да войта. Узаемныя скаргі падалі лаўнік Лявон Ласкевіч і лаўнік Маладзіла. Першы абвінавачваў пісара ў насланні бегуноў і няслушным абвінавачванне з-за купцоў, а другі – ў хаванні ў сваім доме менскіх купцоў, прускага купца Аляксандра Хамельтона і іх тавараў. Нават быў накіраваны для рэвізіі тавараў скарбовы наглядчык Бярко, які быў збіты Ласкевічам падчас агляду (1665). Такое ж абвінавачванне было супраць сына Ласкевіча Захарыяша. Акрамя таго, ён не заплаціў за правоз тытуню, перцу, волава і іншых тавараў (1666). Пры выкананні сваёй працы бегуны маглі патрапіць у непрыемныя сітуацыі. Браты Яніцкія на просьбу агледзіць тавар збілі Анзелма Мошкевіча (1665). Былі яшчэ скаргі ад стражніка генеральнага мытных камор і саляных на Мазовіі і Падляшшы Станіслава Казіміра Багінскага. У ноч з 4 на 5 лістапада 1663 г. невядомы напаў на камору ў Аўгустове, нанёс шкоды будынку, забраў рэчы. Яны былі выяўлены ў Антона Павушкі, падданага Барбары Валовічавай, стольнікавай ВКЛ, які паходзіў з вёскі Скрыннікі маёнтка Балі (Гарадзенскі павет)[50].

*Шляхецкія дакументы ў кнізе войта.* У кнізе змешчаны цэлы шэраг шляхецкіх дакументаў, якія звычайна актыкоўвалі ў гродскія ці земскія кнігі. Пра працу судоў за гэты перыяд захаваліся ўрывачныя звесткі. Кнігі

[46] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 101–102, 126–126 адв., 127 адв., 133–133 адв., 138, 149–149 адв., 165–165 адв., 190, 401–402 адв., 293 і інш.

[47] Ibid., арк. 88–89, 140–140 адв., 154 адв., 163 і інш.

[48] Ibid., арк. 69–69 адв., 167 адв., 193, 194 і інш.

[49] Ibid., арк. 408.

[50] Ibid., арк. 40–42, 81–82, 93–94 адв., 99–99 адв., 104–104 адв., 108–108 адв., 118–120 адв., 122–125, 195–195 адв.

з земскага суда датуюцца 1664 г.[51] Як сведчаць асобныя выпісы гродскі суд працаваў нават у акупацыю[52]. Аднак цалкам прадставіць працу суда за гэты перыяд складана, бо кнігі загрэлі. 9 студзеня 1658 г. у Новым Двары было пасяджанне каптуровага суда[53], хоць кароль быў яшчэ пры ўладзе. Некаторыя выпадкі з Гарадзенскага павету траплялі ў кнігі Троцкага гродскага суда[54]

Большая частка шляхецкіх дакументаў прападае на скаргі, якія па сутнасці прызначаліся для іншых судоў. Іх лёс можна прасачыць у іншых установах, пры ўмове захавання архіваў. Войт не меў паўнамоцтваў разглядаць шляхецкія справы, але для далейшага судовага працэсу была неабходна фіксацыя правапарушэння. Войтаўскі суд падыходзіў для гэтага.

Разгляд нападаў, збіцця адносіцца да кампетэнцыі гродскага суда, але скаргі былі актыкаваны ў войтаўскі суд. Так, Казімір Ян Ейсімант і яго жонка Тэадора Просчыцкая абвінавачвалі Юрыя Яскольда і яго жонку Ягнешку Козыцкую ў нападзе на маёмасць і абразах (1664). З наступнай скаргі вынікае, што гарадзенскі стольнік і войт Крынак Ян Катовіч і яго памочнікі збілі ў Каўбасіно сына жыда Маёра Беняшэвіча, сакольскага арандатара, і забралі больш за 300 злотых, якія ён нёс ад гарадзенскага маршалка Яна Казіміра Кердзея (1670). Гарадзенскія зямяне Тэадор Давідовіч і Габрыэль Эйсімонт скардзілася на Марціна Якубавіча Ляшчынскага аб збіцці і рабаўніцтве ноччу 22 лістапада 1671 г. Габрыэль Эйсімонт быў у Гародні для набыцця рэчаў. Па дарозе да хаты спыніўся ў карчме Ляшчынскага ў Казловічах, дзе быў і Тэадор Давідовіч. Ляшчынскі падпаіў Эйсімонта і павёз у свой двор Казловічы, а там абрабаваў і збіў. Факт збіцця і рабавання засведчыў гарадзенскі енерал Уладзіслаў Трэнчык[55].

Траплялі нават скаргі сямейнага характару з-за пасагу, вена, спадчыны, апекі. У 1652 г. Ганна Снарская абвінавачвала мужа Войцеха Внучку, шляхціча Гарадзенскага павета, у таемнай заставе часткі фальварку Унукаўшчына ў 1652 г. На гэтым уладанні ёй было запісана вена за пасаг у 500 злотых і 500 злотых у рэчах у 1651 г.[56] Тамаш Геральтоўскі з жонкай Юстынай Катлубаеўнай патрабаваў спадчыну ў Міхаіла Катлубая і яго жонкі Аляксандры Сапоцькаўны. Яго бацька Яўстахій Катлубай у 1656 г., як сваяк, узяў у апеку яе і маёмасць Шастакі, пляцы ў Гародні з будынкамі. 28 верасня 1664 г. Юстына выйшла замуж. Да 1 снежня ёй павінны былі перадаць маёмасць. Акрамя таго, Катлубай не аддаў маёнтак Астравец па смерці дзеда Стэфана Бельскага і забраў рухомыя рэчы[57]. Казімір Дашкевіч і яго жонка Аляксандра Боўфалаўна, як ісціца справы, скардзілася на гарадзенскага гродскага пісара Аляксандра Сапоцьку і родных братоў Станіслава, Жыгімонта, Валентына Боўфалаў. У тэстаменце (2 кастрычніка 1658 г.) бацька Дабрагост Боўфал, гарадзенскі чашнік, запісаў пасаг на маёмасці Чупрынова (Гарадзенскі павет). Але сваякі пасаг не выдалі, калі яна ішла замуж, таксама як і спадчыну па памерлай сястры

[51] НГАБ, ф. 1755, воп. 1, спр. 45, 46.

[52] Выпіс з гродскага суда датуецца 15 студзенем 1659 г. LVIA, f. 694, ap. 1, b. 4619, l. 27

[53] LVIA, f. 694, ap. 1, b. 4620, l. 9–10.

[54] VUB, f. 7–3/5957, l. 187–187v

[55] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 53–53 адв., 216–217, 270–271 адв.

[56] Ibid., арк. 24.

[57] Ibid., арк. 71–71 адв.

Кацярыне (1668)[58]. Ваўкавыскі маршалковіч Уладзіслаў Карп падаў скаргу на апекуна бельскага адкаморыя Юзафа Карпа і яго жонку Гальшку Сапежанку. Пасля дасягнення паўналецця ён перадаў маёнткі, але не аддаў дакументы, а таксама не хацеў рабіць справаздачу за перыяд апекі (1666)[59].

У кнігі войта былі зафіксаваны дакументы, звязаныя са справаводствам гродскага суда. Ёсць сведчанні пра прагляд гродскіх кніг у пошуках неабходных дакументаў. Енерал Траян Цырановіч разам з віце-рэгентам гродскай канцэлярыі Базылем Пастэўскім па просьбе Ганны Скуміноўскай, жонкі Крыштафа Узлоўскага, паглядалі кнігі гарадзенскага гродскага суда для выяўлення пратэстацыі ад памерлай Гальшкі Гешкоўскай. За перыяд 1662–1665 гг. падобнага дакумента не знайшлі[60].

У кнізе сустракаецца цэлы шэраг рэляцый гарадзенскіх енералаў па розных выпадках. Напрыклад, Мікалай Кулевецкі падаў сведчанне аб абвяшчэнні з Асэсарскага суда выніку справы Аляксандра Валовіча, стольніка віцебскага. Лісты былі павешаны на дзвярах Фары Вітаўна і яшчэ двух касцёлаў (1670). Фёдар Драздовіч падаў да актыкацыі позву ў Галоўны Трыбунал ВКЛ Яну Казіміру Кердзею, гарадзенскаму маршалку, у справе з Янам Катовічам, аршанскім стольнікам (1671)[61].

Акрамя таго, у кнігі войта трапялі выпісы з гродскіх кніг па розных выпадках: баніцыйны ліст Яну Станіславу Нятупскаму і яго жонцы Зафеі Пугасоўне ў справе з віцебскім стольнікам Аляксандрам Валовічам (1670), пратэстацыя перад гарадзенскім падстаростам Янам Катовічам слугі кароннай падкаморынай Бутлеравай – Андрэя Крыштафа Гробіцкага аб крадзяжу ў яе двары ў Гародні (1672), сведчанне пра вяртанне пазыкі гарадзенскага бурмістра Станіслава Цвікліча яго сынам Казімірам навадворскаму і дуброўскі плябану Яну Казіміру Вайшнаровічу (жамойцкі староста Юрый Караль Глябовіч падарыў пазыку касцёлу, 1672), скарга ксяндза Плавіда Брозына з Росенскага кляштара на чаляднікa Васіля Ярашэвіча аб выкраданні грошай і рэчаў (1673)[62].

Асобную групу дакументаў прадстаўляюць скаргі на дзейнасць гродскага суда і яго ўраднікаў. У разглядаемы перыяд у старостве і судзе пасады займалі: староста – Андрэй Францішак Катовіч (1652–1676), падстаросты Пётр Храптовіч (1659–1663), Альбрэхт Юрый Міцута (1664–1670), Ян Казімір Катовіч (1671–1692), суддзя – Стэфан Ваўжынец Рукевіч (1661–1674), пісары – Альбрэхт Юрый Міцута (1658–1663), Аляксандр Станіслаў Сапоцька (1664–1681)[63].

Наступныя дакументы сведчаць пра мэтанакіраваныя парушэнні ў вядзенні справаводства і судовага працэсу. Старадубскі харужы Самуэль Літавор Храптовіч і яго жонка Канстанцыя Дольская ад сябе і дзяцей памерлага брата Самуэля – Хрызастома, Зафеі і Ганны падалі скаргу аб прымусовым падпісанню пагаднення ў гродскім судзе з Крыштафам

[58] Ibid., арк. 173.
[59] Ibid., арк. 129.
[60] Ibid., арк. 79.
[61] Ibid., арк. 218, 265 і інш.
[62] Ibid., арк. 201–202 адв., 295–295 адв., 332–332 адв., 352.
[63] *Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego*: *Spisy*, t. 2, s. 284, 307, 317, 338.

і Марцінам Храптовічамі з Лідскага павета, гарадзенскім земскім пісарам Пятром Храптовічам (1664). Па дакументу яны павінны выплаціць 3 000 злотых і 300 злотых на касцёл гарадзенскіх бернардынцаў за забойства брата Самуэля ў маёнтку Сенна Навагародскага ваяводства 20 сакавіка 1662 г.[64] Гарадзенскі шляхціч Аляксандр Радунскі быў вымушаны падаць скаргу войту на неправавыя дзеянні гарадзенскага падстаросты А. Міцуты, суддзі С. Рукевіча, гарадзенскага шляхціча Яна Дубянецкага. 5 ліпеня 1664 г. разглядалася справа па позве Яна Дубіны Княжыцкага. Ураднікі не прытрымлівалася права пры выдачы позваў, вынеслі неадпаведны дэкрэт і не дазволілі апеляцыю ў Трыбунал (1665)[65]. Гарадзенскі шляхціч Францішак Чашэйка падаў скаргу на падстаросту А. Міцуту, суддзю С. Рукевіча, што падчас судовых гродскіх рочкаў быў актыкаваны няслушны судовы працэс паміж ім і Юрыем і Адамам Будкевічамі. Быццам бы Чашэйка ўтрымліваў падданага Будкевіча, за што прысудзілі выплаціць шкоды. Ісцец гатовы быў прысягнуць на сваёй невінаватасці і падаў апеляцыю ў Трыбунал ВКЛ (1670)[66].

Калі папярэднія дакументы – гэта скаргі, то наступны – рашэнне па парушэннях ураднікаў. Ад пісара ВКЛ і гарадзенскага старосты Андрэя Катовіча быў накіраваны ліст гродскім ураднікам падстаросце А. Міцуце, суддзі С. Рукевічу і пісару А. Сапоцьку ў справе ўпіцкага падчашыя Андрэя Грушчынскага. Гродскія ураднікі ў 1665 і 1666 гг. у розных месцах абражалі яго годнасць. Згодна з загадам караля забараняліся неадпаведныя дзеянні супраць Грушчынскага пад зарукай 1 000 коп літоўскіх грошаў (1666)[67].

У шэрагу скаргаў фігураваў пісар А. Сапоцька. Гарадзенскі шляхціч Ян Канімер падаў скаргу на яго ў сувязі з неадпаведным абвінавачваннем ў збіцці Яна Гнявінскага, які быў выпраўлены з лістом да гарадзенскага старосты Андрэя Катовіча. Канімер быў у Гародні 11 жніўня, каб аддаць падымнае для казацкай харугвы, і не рабіў ніякіх супрацьпраўных дзеянняў (1664). Лідскі падстолі Канстанты з Ялова Барановіч падаў пратэстацыю на гродскага пісара па прычыне пагрозаў і адмаўленні выдаць выпісы па некаторых справах 7 кастрычніка 1667 г. Дакументы былі яму неабходны як дэпутату ад Лідскага павета на Трыбунал ВКЛ[68]. Гарадзенскі земянін Фабіян Эйсімант абвінавачваў А. Сапоцьку ў фальсіфікаванні дакументаў. Ён унёс у кнігі позву на Эйсіманта, што быццам бы ён намовіў збіццё цівуна і падданага (1668)[69].

Гэта дакумент прадстаўляе Сапоцьку не толькі як дрэннага апекуна, але і яго метады ў дасягненні мэтаў. Марцін Боўфал падаў скаргу на А. Сапоцьку[70]

[64] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 43–44 адв.

[65] Ibid., арк. 87.

[66] Ibid., арк. 203.

[67] Ibid., арк. 107–107 адв.

[68] Канстанты з Ялова Барановіч зафіксаваны як дэпутат на Трыбунал ВКЛ у 1667 г. *Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696). Spis,* oprac. A. Rachuba, H. Lulewicz, Warszawa 2007, s. 301.

[69] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 61–61 адв., 153, 162.

[70] Гарадзенскі енерал Тамаш Цыдзік па загаду Сапоцькі спраўджваў наяўнасць скаргі Марціна Боўфала супраць яго ў войтаўскіх кнігах (1672). Скаргі не было выяўлена, яна была актыкавана пазней. НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 277.

ў справе крыўды сірот, якія засталіся па Дабрагосту Боўфалу – Жыгімонта і Валенціна Боўфалаў. Ён атрымаў ад сяброў атрымаў інфармацыю, што дзеці ў Сапоцькі не атрымліваюць патрэбнае для шляхецкіх дзяцей выхаванне і забеспячэнне, знаходзяцца без апекі і нармальнага харчавання. Пры гэтым Сапоцька трымае іх маёмасць Чупрынава ў Гарадзенскім павеце. Позва была пададзена ў земскі суд у 1671 г., які прызначыў яшчэ ў якасці апекуноў гарадзенскіх ураднікаў падсудка Пятра Храбтовіча і падчашага Марціна Чарніцкага. Але Сапоцька не хацеў разбірацца ў судзе і падаў апеляцыю ў Трыбунал ВКЛ. Ён збіраўся быць дэлегатам, каб вырашыць справу на сваю карысць. Для абрання пісар запрашаў да сябе гасцей, ладзіў банкеты, а на грамнічным сойміку частаваў гарэлкай. Боўфал падаў пратэстацыю на сойміку і ў войтаўскі суд супраць такога абрання ў Трыбунал (1672)[71]. А. Сапоцька сапраўды стаў дэпутатам ад Гарадзенскага павета ў 1672 г.[72] Вышэй прыведзеныя дакументы сведчаць пра злоўжыванні А. Сапоцькі на сваёй пасадзе. Аднак такія правапарушэнні былі магчымыя пры падтрымцы калегаў.

У наступных дакументах фігураваў рэгент гродскай канцылярыі Станіслаў Нятупскі. Андрэй Казімір Прыбоўскі падаў скаргу на яго па прычыне адмовы актыкаваць і даць выпісы для каронага рэферэндара Яна Дабрагоста Красінскага і яго жонкі (1668). Гарадзенскі маршалак Ян Казімір Кердзей абвінавачваў намесніка падстаросты А. Міцуты Грыгорыя Станіслава Занеўскага і Я. Нятупскага ў махінацыях з выпісамі з суда спраў жонкі маршалка Крыштафа Бухавецкага – Ізабэлы Вільчкоўны, дачкі смаленскага кашталяна Самуэля Вільчка (1669). Пры гэтым у скарзе было адзначана, што маршалка папярэджвалі аб неправавых дзеяннях у гродскай канцылярыі. Берніцкі староста Казімір Сенпкоўскі падазраваў у змове берніцкага плябана Андрэя Руткоўскага і Я. Нятупскага. У 1669 г. плябан атрымаў з гарадзенскага каптуровага ўраду дэкрэт на скаржніка. Была дамова аб аддачы грошай плябану, а ён не хацеў іх браць. Да таго ж плябан ініцыяваў справу супраць Сенпкоўскага ў Трыбунале (1670). Нятупскі павінен быў пільнаваць законнасць справы, а сам затрымаў пры сябе дакументы. У выніку скаржніку прысудзілі баніцыю[73].

Прыведзеныя дакументы сведчаць пра карупцыю і трывалую практыку парушэнняў у гродскім судзе. Пры чым тут былі задзейнічаны ўсё ураднікі. Такая сітуацыя стала магчымай у выніку вайны, слабай каралеўскай і цэнтральнай улады. Ураднікі дзейнічалі так, як быццам бы былі абсалютна ўпэўнены ў сваім панаванні і беспакаранасці.

Асобную групу дакументаў прадстаўляюць справы аб павятовых падатках. Яны прадстаўляюць канфлікты і парушэнні з боку гродскіх ураднікаў і паборцаў. У сувязі з вайной многія палітычныя, фінансавыя і вайсковыя рашэнні важныя для павета прымаліся на гарадзенскім сойміку. 20 лістапада 1655 г. гарадзенская шляхта ўхваліла далучэнне да Кейданскай

[71] Ibid., арк. 282–282 адв.

[72] *Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696),* s. 316.

[73] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 175, 186, 255.

уніі[74]. 18 кастрычніка 1661 г. у абозе пад Мерaччу на сойміку было прынята рашэнне пра збор падаткаў для казацкай харугвы Гарадзенскага павета. Ваенная небяспека заставалася актуальнай і надалей. Таму соймік ад 12 жніўня 1664 г. ухваліў збор падымнага для выправы казацкай харугвы на паспалітае рушэнне. Падатак павінны былі сабраць да 20 жніўня. Падчас збору падаткаў сталі адбывацца надзвычайныя рэчы. Шляхта прывозіла грошы ў горад, у суд, а гродскі пісар і паборца А. Сапоцька адмаўляўся іх браць. На яго ў войтаўскі суд падалі скаргі троцкі падчашы Мікалай Лімант (аддаў з маёнтка Масаляны падатак енералу Андрэю Крыштафу Міленькаму), слуга віленскага скарбніка Дадзібога Градкоўскага Юзаф Болевас (падаваў падатак з Вайцяхоўшчыны, якую ў заставе трымала Зафея Пацаўна, жонка Яна Хадкевіча, віленскага кашталяна)[75].

У наступным годзе слуга і ўраднік Жыгімонта Вальта, палкоўніка і двараніна Яго Каралеўскай Міласці, Андрэй Кліцкі сутыкнуўся з іншай праблемай. 7 верасня 1665 г. ён прывёз паборцу Крыштафу Міцуце падатак з Гарасімовіцкага двара (64 дымаў) і з фальварку Астровін (20 дымаў) 520 злотых і 24 грошаў. Паводле лаўдума сойміка падаткі прызначаліся, у тым ліку, і на выпраўленне на сойм Тамаша Валовіча і земскага пісара Пятра Храпавіцкага. Як гэта і патрабавалася, Кліцкі папрасіў у паборцы квіт аб атрыманні грошаў. Міцута адмовіўся выдаць дакумент[76]. Канешне, на такія дзеянні неабходна было падаваць скаргу, бо за гэта гаспадару пагражала новая выплата грошай, а слугу маглі абвінаваціць у крадзяжы.

Зборам падаткаў з Гарадзенскага павета былі незадаволеныя ў Скарбовым Трыбунале ВКЛ. Інстыгатар ВКЛ Ян Замбрыцкі абвінавачваў паборцу А. Сапоцьку ў тым, што ён не выплаціў у скарб 3 860 злотых, 8 грошаў і 3 пенезяў, не аддаў рэестры, не прыехаў на суд. У выніку прысудзілі аправіць грошы на маёмасці і інфамію (1671)[77].

У гэты ж год таварышы рот гетмана ВКЛ Міхаіла Казіміра Паца Стэфан Тамашэвіч і Тэадор Карэнкоўскі, маёр Яго Каралеўскай Міласці Андрэй Казімір Окльшр і мціслаўскі падстолі Стэфан Казімір Маскевіч абвінавачвалі А. Сапоцьку і скарбовага двараніна Яна Мацяркоўскага ў неадпаведным зборы падаткаў. Яны наносілі шкоды гаспадарам, забіралі маёнткі[78].

Гарадзенскія ўраднікі і паборцы для выбрання шэляжнага – чашнік Андрэй Талочка, скарбнік Тамаш Станіслаў Аземблоўскі, мечнік Юзаф Вінскі – падалі скаргу на гродскі суд. Яго ўраднікі ўнеслі ў лаўдум сойміка ад 29 кастрычніка 1673 г. пункт аб справаздачы паборцаў перад каптуровым судом. Шляхцічы пратэставалі супраць такіх зменаў, бо такой пастановы няма ў заканадаўстве, а рахункі прадстаўляліся ў скарб. Пратэстацыю адмовіліся прымаць ў канцылярыі гродскага суда. Таму яна патрапіла ў кнігу войта[79].

Некаторыя дакументы прадстаўляюць дзейнасць земскага суда.

[74] А. Катлярчук, *У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швецыя ў часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст.*, «Arche», 2008, № 7–8 (70–71), с. 651.

[75] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 58, 59–60.

[76] Ibid., арк. 92–92 адв.

[77] НГАБ, ф. 1703, воп. 1, спр. 3, арк. 170–171 адв.

[78] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 251, 269.

[79] Ibid., арк. 360.

Ліст гарадзенскага земскага падсудка Тамаша Валовіча быў накіраваны гродскаму суддзі С. Рукевічу ў справе яго пазыкі братам Яхіму, Яну і Марціну Гарбачэўскім. Паводле пастановы Трыбунала ВКЛ у Вільні ад 6 чэрвеня 1665 г. 4 804 злотых былі апраўлены да маёмасці Галавачы ў Гарадзенскім павеце. Братоў увялі ў валоданне ў 1667 г.[80]

Былі скаргі на дзеянні ўраднікаў земскага суда. Мікалай Эйсімант абвінавачваў суддзю Тамаша Валовіча, падсудка Пятра Храптовіча ў неадпаведных прававых дзеяннях у справе па маёмасці Мілкаўшчызна (1671)[81]. Гродскі суд таксама прымаў скаргі на ўраднікаў земскага суда. Станіслаў Львовіч Галаўня, кліент канюшага ВКЛ Багуслава Радзівіла, падаў скаргу на суддзю К. Александровіча і падсудка Т. Валовіча за парушэнні ў вядзенні судовага працэсу. Пры разглядзе справы смаленскага дэкана Фаўстына Нечэркуўскага яго не дапусцілі да абароны сваёй пазіцыі (1664)[82].

У кнізе зафіксаваны нават выпадак з гарадзенскага сойміка. Па прычыне адмовы прыняць пратэстацыю гродскім судом гарадзенскі маршалак Ян Кердзей вымушаны быў падаць скаргу на Матыяша і Габрыэля Эйсімантаў у войтаўскі суд (1676). Падчас правядзення сойміку ў рэфекторыі (сталоўцы) гарадзенскага бернардзінскага касцёла яны папрасілі выступіць, а самі ўчынілі зваду з Драганям. На наступны дзень Марыяш пабачыў Драганя на вуліцы, і той ледзь выратаваўся ў брыгіцкім касцёле[83]. Дадзены выпадак невядомы ў гістарыяграфіі. За гэты год не выяўлена лаўдума. Гэты дакумент важны па свайму значэнню, бо дадае інфармацыю па палітычнай гісторыі павета, якая захавалася фрагментарна. Здарэнне пацвярджае меркаванне, што соймікі праводзіліся ў бернардзінскім касцёле не толькі ў XVIII ст., але і ў XVII ст. Згаданы соймік быў не адзіным, на якім адбыўся канфлікт[84].

Такім чынам, кніга войта за 1660–1676 гг. з'яўляецца важнай крыніцай па гісторыі горада і рэгіёна. Яна з'яўляецца істотным дадаткам да кнігі войтаўска-лаўніцкага суда 1659–1674 гг. Разам яны прадстаўляюць дзейнасць і паўнамоцтвы войта. Наяўнасць толькі адной кнігі абмяжоўвае магчымасць прасачыць тэндэнцыі ў інстытуце войтаўства пачынаючы з 1496 г.

У сваёй большасці кніга складаецца са скаргаў, вынікі якіх і праўдзівасць цяжка вызначыць без судовага працэсу. Аднак у іх прадстаўлены розныя аспекты па крымінальнай сітуацыі, маёмасных дачыненнях, судоваму працэсу, гарадскому жыццю і інш.

Шэраг дакументаў мае непасрэднае дачыненне да шляхты, судовых устаноў (гродскага, земскага, каптуровага судоў), сойміка. Яны з'яўляюцца важнымі крыніцамі па адміністраванню ў павеце падчас акупацыі і пасля вызвалення ад маскоўскіх войскаў. Дакументы сведчаць пра крызіс улады і карупцыю ў павятовым кіраванні.

[80] Ibid., арк. 143–143 адв.

[81] Ibid., арк. 222, 230.

[82] AGAD, Archiwum Radziwiłłów, dz. II, sygn. 1495.

[83] НГАБ, ф. 1761, воп. 1, спр. 2, арк. 423.

[84] В. Галубовіч, *Соймік Гарадзенскага павета ў XVI–XVII стст.* [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XXст.,* рэд. А.Ф. Смаленчук, Н.У Сліж, Гародня 2009, с. 152–178; Г. Паўлоўская, *Апісанне гарадзенскіх соймікаў у хроніках бернардзінскага кляштара,* [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009*, с. 220–237.

Шляхта прызнавала магчымасць актыкацыі дакументаў у суд войта. Запіс быў неабходны для надання законнасці. Суд узначальваў шляхціч. У выпадку Канстанты Александровіча яшчэ і наяўнасць пасады ў земскім судзе, што азначала знаёмства са справаводствам шляхецкіх спраў.

Суд войта не існаваў ізалявана. Ён быў уключаны не толькі ў справы мешчан, але і шляхты. Ва ўмовах вайны немагчыма было захаваць вызначаны падзел улады і паўнамоцтваў. Акрамя таго, статус суда войта ўзрос у сувязі са крызісам павятовай улады.

## Спіс крыніц і літаратуры

### Неапублікаваныя крыніцы:

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 694, воп. 4, спр. 2035; ф. 1703, воп. 1, спр. 3; ф. 1755, воп. 1, спр. 45, 46, 47; ф. 1761, воп. 1, спр. 2, 3; ф. 1786, воп. 1, спр. 4; ф. 1800, воп. 1, спр. 1; КМФ-18, спр. 110, 132, 149, 258, 312.

Archiwum Główne Akt Dawnych, Archiwum Radziwiłłów, dz. II, sygn. 1495; dz. IV, kopie, sygn. 745; dz. V, sygn. 11208/II, sygn. 1735.

Lietuvos mosklų akademijos Vrublevskių Bibliotekos Rankraščių skyrius, f. 16-207.

Lietuvos Vaistybes istorijos archyvas, f. 694, ap. 1, b. 4619, 4620; f. 1219, ap. 1, b. 937.

Vilniaus Universiteto Bibliotekos Rankraščių skyrius, f. 7, Kauno magistrato aktų knyga, 1580–84; Kauno magistrato aktų knyga, 1606–08; f. 7–3/5957

Zakład Narodowy im. Ossolińskich, rkps. 5620.

### Апублікаваныя крыніцы:

*Акты Виленской Археографической комиссии*, т. 7: *Акты Городненского гродского суда*, Вильна 1874.

*Акты Московского государства, изданные Императорской Академией Наук*, т. 2, Санктпетербург 1894.

Историко-юридические материалы, извлечённые из актовых книг губернии

Витебской и Могилёвской, хранящихся в центральном архиве в Витебске, вып. 30, Витебск 1903.

Lietuvos Metrika (1522–1530), 4-oji Teismų knyga, parengė S. Lazutka, I. Valikonitė, Vilnius 1997.

*Помнікі мемуарнай літаратуры Беларусі XVII ст.*, Мінск 1983.

Chrapowicki J. A., Diariusz, cz. 1: 1656–1664, oprac. T. Wasilewski, Warszawa 1978.

Chrapowicki J. A., Diariusz. cz. 3: lata 1669–1673, oprac. L.A. Wierzbicki, Warszawa 2009.

Pamiętniki Samuela i Bogusława Kazimierza Maskiewiczow (wiek XVII), oprac. A. Sajkowski, Wrocław 1961.

**Літаратура:**

Галубовіч В., *Соймік Гарадзенскага павета ў XVI–XVII стст.* [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XXст.,* рэд. А.Ф. Смаленчук, Н.У Сліж, Гародня 2009, с. 152–178.

Герасімава І., *Маравая пошасць у акупаванай Вільні (1657 год),* «Arche. Гісторыя беларускай штодзённасці», 2012, № 3, с. 96–108.

Дружчыц В., *Войты і іх улада ў беларускіх гаспадарскіх местах з магдэбурскім правам,* «Arche», 2009, № 7, с. 338–386.

Касажэцкі К., *Кампанія 1660 году ў Літве,* Адбітка з 6 нумару часопіса «Arche» за 2006 год, Мінск 2011.

Катлярчук А., *У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швецыя ў часе эўрапескага крызісу сярэдзіны XVII ст.*, «Arche», 2008, № 7–8 (70–71), с. 366–679.

Копысский З. Ю., *Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в.* Минск 1975.

Мальцев А. Н., *Россия и Белоруссия в середине XVII в.*, Москва 1974.

Паўлоўская Г., *Апісанне гарадзенскіх соймікаў у хроніках бернардзінскага кляштара,* [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009*, *Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XXст.,* рэд. А.Ф. Смаленчук, Н.У Сліж, Гародня 2009, с. 220–237.

Сліж Н., *Арганізацыя гандлю ў Горадні ў XVI – першай палове XVII стагоддзя,* [у:] *Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання. Матэрыялы I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 14–16 лістапада 2013 г.)*, Мінск 2014, с. 130–149.

Сліж Н., *Злачынства і злачынцы ў Гародні ў XVII ст.,* «Arche», 2014, № 11, с. 122–182.

Сліж Н., *Магдэбургскае права ў Гародні ў канцы XV – першай палове XVI ст.: увядзенне і развіццё*, [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст.*, рэд. А.Ф. Смаленчук, Н.У. Сліж, Мінск 2012, с. 10–44.

Яцкевіч З., Урублеўскі В., *Гарадзенскі магістрат у XVII ст.* [у:] *Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV–XX ст.*, рэд. А.Ф. Смаленчук, Н.У. Сліж, Гародня 2009, с. 75–117.

Borowik P., *Funkcjonowanie samorządu miejskiego w Grodnie podczas «potopu moskiewskiego» (1655–1661) oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali,* [у:] *Гарадзенскі палімпсест XII–XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 7 лістапада 2008 г.),* рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж, Гародня–Беласток 2008, с. 29–39.

*Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1582–1696). Spis,* oprac. A. Rachuba, H. Lulewicz, Warszawa 2007.

Rimša E., *Pieczęcie miast Wielkiego Księstwa Litewskigo*, tłum. J. Sienkiewicz, Warszawa 2007.

*Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego: Spisy*, t. 2: *Województwo Trockie XIV–XVIII wiek*, red. A. Rachuba, Warszawa 2007.

**Наталля Сліж**
Беларускі інстытут правазнаўства, Гродзенскі філіял

## ДЗЕЙНАСЦЬ СУДА ГАРАДЗЕНСКАГА ВОЙТА Ў 1660–1676 ГГ.

**Рэзюмэ:** Сістэма кіравання ў магістратах ВКЛ даўно звяртае на сябе ўвагу даследчыкаў. Для кожнага горада былі свае асаблівасці ўвядзення войтаўства. Дзейнасць гарадзенскага войта ў другой палове XVII ст. да гэтага часу не была прадметам даследавання. Кніга з суда войта 1660–1676 гг. – гэта толькі адна кніга, якая захавалася да сённяшняга дня. Яна з'яўляецца важным дадаткам да кніга войтаўска-лаўнічага суда 1659–1674 гг. Большасць дакументаў – гэта скаргі, вынікі якіх цяжка прадставіць без судовага працэсу. Але яны ўтрымліваюць інфармацыю пра розныя аспекты: крымінальная сітуацыя, маёмасныя адносіны, судовы працэс і інш. Шэраг дакументаў мае дачыненне да шляхты. Яны з'яўляюцца важнымі крыніцамі пра ўладу ў Гарадзенскім павеце падчас акупацыі і пасля вызвалення ад маскоўскіх войскаў. Агульна, кніга войта выразна паказвае статус войта ў горадзе і павеце, яго працу ў судзе і магістраце.

**Ключавыя словы**: гарадзенскі войт, суд, судовыя дакументы.

**Natallia Slizh**
Belarusian Institute of Law Hrodna branch

## THE ACTIVITIES OF THE MAYOR'S COURT IN HRODNA/GRODNO IN 1660–1676

**Summary:** The scholars pay much attention to the system of administration in towns of the GDL. The official "the mayor" had its own specific in each town. The activity of the mayor of Hrodna in the second half of the seventeenth century has not been studied yet. The mayor court book of 1660–1676 is the only book from this court. It is essential addition to the book of the magistrate court of 1659–1674. Most of documents are complaints. Their results are difficult to image without judicial process. However, they contain information on various aspects: criminal situation in the town, property relations, judicial process and etc. A number of documents have a touch to the nobility. They are important sources about power in the Hrodno region under Moscow occupation and after liberation from the Muscovite forces. In general, the mayor book shows clearly the status of the mayor in the town and region, his work at the court and magistrate.

**Keywords**: the mayor of Hrodna, court, court documents.